

# Падтрымаць працавітых і талерантных

## Дэпутаты абласнога Савета выехалі ў Іўеўскі раён, каб ацаніць работу органаў мясцовага самакіравання

**ІЎЕ — адзін з маладых гарадоў Гродзенскай вобласці. Свой статус яно набыло гадоў каля дваццаці таму.**

Ды і само з ліку маладых — сёлета тут адзначылі 575-гадовы юбілей. І хоць Іўеўскі раён лічыцца сельскагаспадарчым, летась Іўе прызналі найлепшым у вобласці па вядзенні бізнесу сярод гарадоў з насельніцтвам да 25 тысяч чалавек.

### Татары-агароднікі

Значны рывок у бізнесе звязаны ў тым ліку і з удасканальваннем заканадаўчай базы. У раёне самая вялікая колькасць фермерскіх гаспадарак — больш за паўсотні. Гэта палова ўсяго фермерскага корпуса Гродзенскай вобласці. Яшчэ 200 участкаў знаходзіцца ў арэндзе. Праца на зямлі — традыцыйны занятак мясцовых татар, якія тут кампактна пражываюць ажно з XIV стагоддзя. У прыватным сектары, напрыклад, вырошчваюць да шасці тысяч тон памідораў за сезон.

Цяпер гэта трактуецца як самазанятасць, хоць некалькі гадоў таму агароднікі павінны былі плаціць падатак, бо жывуць у горадзе. Прадстаўнікі татарскай дыяспары неаднаразова звярталіся ў розныя інстанцыі, каб дамагчыся аднолькавых умоў для тых, хто займаецца працай на зямлі. Пасля таго як былі ўнесены змяненні ў Дэкрэт аб садзейнічанні занятасці, такіх пытанняў не ўзнікае. А мясцовыя ўлады шукаюць магчымасці для цывілізаванага гандлю, у прыватнасці, унесена прапанова аб стварэнні лагістычнага цэнтра па забеспячэнні Гродзенскай вобласці гароднінай.

### Малыя вёскі вялікага раёна

І гэта яшчэ адна асаблівасць Іўеўскага раёна, які з'яўляецца трэцім па плошчы ў вобласці. Значная частка насельніцтва пражывае ў невялікіх вёсках, а такіх тут каля 300. Таму дзейнасць дэпутацкага корпуса асабліва актуальная, паведаміў падчас выязной сесіі **старшыня райвыканкама Аляксандр БУЛАК.** Ён расказаў, што мясцовыя ўлады робяць усё магчымае, каб людзі ва ўсіх населеных пунктах — у аграгарадках і на хутарах — мелі магчымасць сачыць за сваім здароўем, а пры неабходнасці — лячыцца, купляць патрэбныя рэчы і прадукты, адпраўляць дзяцей у добрую школу.

Пытанні, безумоўна, узнікаюць. Іх нямала. Напрыклад, аналіз зваротаў за тры гады выявіў нямала фактаў, якія датычацца навядзення парадку на зямлі і стану дарог. Але сітуацыя змяняецца ў лепшы бок — дарогі рамантуюцца, парадак наводзіцца. І як вынік — амаль год па гэтых тэмах ад жыхароў раёна не паступалі скаргі.

Трэба сказаць, што адметную ролю ў гэтым адыгралі абласныя «Дажынкі», якія праходзілі тут летась. Пры падрыхтоўцы да фестывалю ў раёне адрамантавана 120 аб'ектаў, у асноўным сацыяльнай сферы, і звернута ўвага на вулічна-дарожную сетку.

Для дэпутацкага корпуса добрым прыкладам здаровага ладу жыцця стала наведванне новага стадыёна, які з'явіўся каля школы летась. Тут абсталяваны некалькі пляцовак з сінтэтычным пакрыццём для розных відаў спорту, у тым ліку лёгкаатлетычная дарожка. З'явіліся трыбуны для гледачоў. Сёння гэта папулярнае месца як для школьнікаў, так і для ўсіх жыхароў Іўя. Тут можна ўбачыць аматараў папулярнай скандынаўскай хады. А многія нават заняліся бегам і прыходзяць займацца цэлымі сем'ямі.

### Горад талерантнасці

Для Іўя гэта не проста словы, а стан жыцця. Бо на кавалку беларускай зямлі сышліся чатыры даволі значныя канфесіі — каталікі, праваслаўныя, мусульмане і іўдзеі. І на працягу многіх стагоддзяў усе яны жывуць у згодзе. Адзінства тут замацавана яшчэ і ў манументе. На цэнтральнай плошчы высіцца памятны знак у гонар дружбы канфесій Іўеўскага краю. Старшыня райвыканкама Аляксандр Булак падкрэсліў, што ўлады падтрымліваюць культурную спадчыну кожнай канфесіі. Сведкай гэтаму можна лічыць адзіны ў рэспубліцы музей нацыянальных культур, якому сёлета споўнілася 10 гадоў.



Дарэчы, і самі дэпутаты даведаліся шмат цікавага з гісторыі Іўеўскага краю. Напрыклад, тое, што тут татарская абшчына самая вялікая ў Беларусі і налічвае каля 800 чалавек. Каб захаваць сваю рэлігію, татары з пакалення ў пакаленне перапісвалі свае свяшчэнныя кнігі на беларускай і польскай мовах, але арабскімі літарамі. У музеі захоўваюцца Каран 1902 года, рукапісны зборнік малітваў, з аўтэнтычных прадметаў — шпіль мінарэта, падсвечнікі з мячэці. Дарэчы, іўеўская мячэць — адзіная ў Беларусі, якая працуе няспынна з моманту яе пабудовы ў 1882 годзе. Аб'ект з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства. Служыць тут муфцій Адам Радзецкі, які яшчэ і кіруе татарскай абшчынай. Цікава, што ён выкладае ў мясцовай школе беларускую мову і літаратуру.

Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса змаглі ўпэўніцца, як важна развіваць народную творчасць, падтрымліваць культуру. Напрыклад, у Іўі развіта саломкапляценне, тут ствараюць сапраўдныя шэдэўры. І творчых асоб даволі шмат — у 140 калектывах займаецца больш за 1200 жыхароў раёна. Развіваецца добры дзясятак відаў традыцыйнай народнай творчасці.

У Іўі клапоцяцца пра будучыню раёна. А гэта ў першую чаргу замацаванне маладых спецыялістаў. Было адзначана, што для камфортнага іх пражывання летась адрамантаваны былы інтэрнат. Цяпер тут амаль 20 кватэр займаюць маладыя работнікі розных сфер дзейнасці.

**Фота ivyenews.by і аўтара.**

# БЫЛАЯ СІНАГОГА ПРЫМАЕ ТУРЫСТАЎ

## Аб чым расказаў дэпутат райсавета ў падарожжы па былым яўрэйскім квартале

**Гэта цэнтр гарадскога пасёлка Мір. Вядома, ён тоіць нямала цікавых гістарычных фактаў. Руслан АБРАМЧЫК знаёміць з некаторымі з іх. Але як дэпутат раённага Савета дэпутатаў і намеснік старшыні Карэліцкага райвыканкама ён звяртае ўвагу на сённяшні воблік гарадскога пасёлка. І здаецца, што мінулае і сучаснасць цесна пераплецены паміж сабой. Так на самай справе яно і ёсць.**

Захаваць старажытныя аб'екты без гаспадарскай рукі немагчыма. Таму многія пабудовы былога яўрэйскага квартала атрымалі другое жыццё.

Падчас падарожжа Руслан Абрамчык звяртае ўвагу на будынак сучаснай аптэкі. А калісьці тут месцілася ешыва — вышэйшая іўдзейская навучальная ўстанова па падрыхтоўцы рабінаў. І вучыцца сюды ехалі маладыя яўрэі з усёй Еўропы.

Літаральна нядаўна на аптэцы з'явілася мемарыяльная дошка, прысвечаная японскаму консулу ў Літве Ціўнэ Сугіхара. Чаму менавіта яму? Як расказаў суразмоўца, напачатку Другой сусветнай вайны дыпламат дапамог пераехаць вучням ешывы спачатку ў Вільню, а затым у Японію і Кітай. Такім чынам ён выратаваў каля шасці тысяч яўрэяў. Дарэчы, былыя навучэнцы не забылі сваю альма-матар. Яны адрадзілі яе пад назвай «Мір» з аддзяленнямі ў Нью-Ёрку і Ерусаліме.

Далей наш шлях ляжыць да былых сінагог. Тут захаваўся цэлы комплекс будынкаў, у тым ліку Галоўная сінагога, купецкая, дом рабіна і іншыя. Некаторы час яны пуставалі, і вось нарэшце знайшліся гаспадары.

— Гістарычны комплекс знаходзіўся ў камунальнай уласнасці. Не так даўно яго выкупіла сталічная фірма і адкрыла тут гасцінічна-рэстаранны бізнес, — паведаміў дэпутат райсавета. — Для пасёлка гэта вельмі ўдалы кірунак, бо тут знаходзіцца знакаміты Мірскі замак і прыязджае нямала турыстаў. Да таго ж праведзена рэканструкцыя старых будынкаў, цяпер яны яшчэ доўга прастаяць.

Каб затрымаць у пасёлку турыстаў, улады ідуць насустрач прадпрымальніцкім ініцыятывам. Напрыклад, уладальнікам гасцінічнага бізнесу яны гатовы даць зямельны ўчастак для будаўніцтва спа-комплексу з басейнам, саўнай, касметалагічнымі працэдурамі. Дарэчы, хутка пачнецца рэканструкцыя так званай купецкай сінагогі пад гасцініцу.

Цяпер у гасцінічным фондзе прадпрымальнікаў каля 40 нумароў, у тым ліку і люкс, кошт якога дасягае 200 рублёў за суткі. Але гэта, вядома, не адзіны гатэль у пасёлку. Ёсць тут гасцініца камунальнай уласнасці, а таксама ў Мірскім замку.

Трэба сказаць, што замак захапляе сваім велічным выглядам. Але мала хто ведае, што ў 1942 годзе тут некалькі месяцаў было размешчана яўрэйскае гета.

Мы працягваем наша падарожжа па былым яўрэйскім квартале. І тут таксама ёсць чым уразіцца. Насупраць былых сінагог месціцца былая карчма. Праўда, яе функцыя даўно страчана, а гадоў пятнаццаць таму будынак купіў аматар старажытнасці Віктар Сакель і стварыў прыватны музей яўрэйскай культуры.



Як расказаў сам гаспадар, усе экспанаты мясцовыя, многія знойдзены пры раскопках у замку яшчэ да яго рэстаўрацыі, многія трапілі на вочы пры пракладцы інжынерных сетак. Тут знаходзіцца вялікі клад старажытных манет. Іх Віктар знайшоў, калі заліваў фундамент.

Уражваюць арыгіналы дакументаў канца XIX стагоддзя. Напрыклад, царскі ўказ 1892 года аб дапамозе пагарэльцам Міра. Як вядома, пасёлак некалькі разоў моцна выгараў, і захаваліся нават спісы жыхароў, каму і колькі было ахвяравана пасля пажару.

Смутак выклікаюць рэчы, якія засталіся пасля арыштаў яўрэяў. Прадметы побыту, посуд, кнігі, адзенне — многае захавалася толькі таму, што было закапана альбо схавана. Напрыклад, скрутак палатна праляжаў у зямлі паўстагоддзя, і, што цікава, цяпер у добрым стане. Гадзіннік ідзе больш за сто гадоў, ды яшчэ з боем. А патэфонаў тут некалькі. І некаторыя працуюць, пласцінкі 30-х гадоў гучаць незабыўна. Дарэчы, у музей трапілі і некаторыя рэлігійныя прадметы з куфра рабіна, які знайшлі падчас рэканструкцыі рэстарана яго ўласнікі.

Музей — не адзіны аб'ект Віктара Сакеля. Ён купіў яшчэ адзін дом побач і стварыў аграсядзібу. Цяпер у яго таксама свой невялікі, але цікавы комплекс.

Нядаўна мясцовыя ўлады распачалі супрацоўніцтва з грамадскімі яўрэйскімі абшчынамі. Так, міжнародны студэнцкі цэнтр зацікавіўся тутэйшымі старажытнымі могілкамі. У Мір з'ехаліся студэнты-валанцёры з многіх краін, каб правесці дакладную інвентарызацыю. Цяпер гэта тэрыторыя на балансе сельскага Савета, але тут можна стварыць сапраўдныя турыстычныя аб'екты.

— Яўрэйскія могілкі даволі вялікія, але мы нічога пра іх не ведаем, бо не можам прачытаць надпісы, і нам дапамогуць валанцёры. Пасля таго як будзе ўсё задакументавана, можна падаць заяўку на ўключэнне могілак у спісы помнікаў гісторыка-мемарыяльнай каштоўнасці. І гэта апраўдана, бо могілкі старажытныя, заснаваны можа дзесьці ў XVII стагоддзі, а апошнія пахаванні тут адбываліся ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, — расказаў Руслан Абрамчык.

Ёсць планы і на наступны год. Саюз яўрэйскіх абшчын мае намер прафінансаваць рэканструкцыю і замену мемарыяльных знакаў на месцах масавых расстрэлаў. І хоць сельскія Саветы Карэліцкага раёна даглядаюць тэрыторыю, многія знакі патрабуюць аднаўлення, бо былі ўстаноўлены яшчэ ў 60-я.

Цяпер былы яўрэйскі квартал мае іншы воблік, сучасны і турыстычны. Па гэтым шляху гарадскі пасёлак будзе ісці і далей. Мір — адзін з 16 пасёлкаў, якія вылучаны ў пілотны праект дзяржаўнай праграмы па добраўпарадкаванні. І многае ўжо зроблена, адзначыў Руслан Абрамчык. Прыведзены ў належны стан дарогі, сістэма водазабеспячэння, сацыяльныя аб'екты. Мірскі замак — адзін з чатырох аб'ектаў Беларусі, якія ўключаны ў спіс ЮНЕСКА, і вельмі папулярны сярод турыстаў. Многія з іх любяць спыняцца ў гасцініцах, якія абсталяваны ў гістарычных будынках.

**Фота аўтара.**

**Матэрыялы падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ.**